З першых вуснаў

# «СІТУАЦЫЯ НА БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКАЙ ГРАНІЦЫ СТАБІЛІЗАВАНА»

«Не трэба хваляваца. Памятаеце, некалькі гадоў таму я сказаў, што кожны на сваім працоўным месцы павінен рабіць сваю справу. Усё, аб чым я кажу, гэта мая турбота і людзей у пагонах. Мы справімся. Я вам гарантую, што ніякіх сутыкненняў на граніцы з Украінай мы не дапусцім. Іх не будзе, бо яны не патрэбныя нам, і яны яшчэ больш не патрэбныя Украіне ў сувязі з тымі падзеямі, якія разгортваюцца на полі бою», — заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на ўрачыстым сходзе, прысвечаным Дню Незалежнасці. Тады ў святочны дзень кіраўнік дзяржавы на ўсю краіну гаварыў і на несвяточныя тэмы, каб крыху супакоіць насельніцтва, чыё хваляванне падагравалася абмеркаваннямі ў інтэрнэце. Прынамсі, нагоды для хвалявання былі. Напачатку ліпеня сітуацыя на беларуска-ўкраінскай граніцы была напружанай, назіралася павышаная актыўнасць украінскіх ваенных, на беларускую тэрыторыю ад суседзяў залятаці беспілотнікі. Беларускія пагранічнікі гэта адразу заўважылі, прынялі неабходныя меры, былі разгорнуты сілы спецыяльных аперацый, разведвальныя сілы, у высокай баявой гатоўнасці знаходзіліся войскі ваенна-паветраных сіл і супрацьпаветранай абароны, на пазіцыі выведзеныя ракетныя «Іскандэр» і «Паланэз».

«Я б папрасіў украінцаў не гуляць з агнём. Гэта вельмі небяспечна», — заяўляў Аляксандр Лукашэнка і папярэджваў, што ў выпадку чаго адказ будзе імгненным і жорсткім — ніякіх чырвоных ліній. У той жа час Прэзідэнт неадназова казаў, што беларусы не планавалі і не плануюць пачынаць ці ўдзельнічаць ва ўзброеным канфлікце, нам ён проста не патрэбны. Таму і пытанне напружанасці на беларуска-ўкраінскай граніцы было вырашана мірным шляхам.

## Я паабяцаў людзям, што з сітуацыяй мы справімся

У мінулую суботу Прэзідэнт наведаў месца дыслакацыі 56-га зенітнага ракетнага палка, што ў Лунінецкім раёне Брэсцкай вобласці. У штабе палка прайшла нарада па пытаннях забеспячэння ваеннай бяспекі краіны на паўднёвым аперацыйным напрамку, удзел у якой прынялі дзяржсакратар Савета Бяспекі Беларусі Аляксандр Вальфовіч, старшыня КДБ Іван Тэртэль, міністр унутраных спраў Іван Кубракоў, міністр абароны Віктар Хрэнін, начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл Павел Муравейка, старшыня Дзяржпагранкамітэта Канстанцін Моластаў, камандуючы сіламі спецыяльных аперацый Узброеных Сіл Вадзім Дзенісенка, камандуючы ВПС і войскамі ППА Андрэй Лук'яновіч.

Падчас нарады Аляксандр Лукашэнка заявіў аб ліквідацыі напружанасці на граніцы з Украінай пасля значнай эскалацыі абстаноўкі некаторы час таму, на што беларускі бок вымушаны быў рэагаваць. «Мне Камітэт дзяржбяспекі дакладваў і ваенная разведка аб тым, што пасля нашай пэўнай работы украінцы свае ўзброеныя сілы і дадатковыя войскі, якія яны перакінулі да нашай граніцы (гэта было нямала тысяч чалавек), ад граніцы адвялі і наогул вывелі з зоны беларуска-ўкраінскай граніцы. Гэта значыць, тыя войскі, якія ўзмацнялі іх дзеянні, з граніцы выйшлі», — адзначыў Прэзідэнт. Па яго словах, абвастрэнне сітуацыі зусім не было патрэбна беларускаму боку і тым больш яно не патрэбна Украіне.

Дээскалацыя напружанасці, якая адбылася ў выніку прынятых Беларуссю мер, сведчыць, што абяцанні кіраўніка дзяржавы аб тым, што ваенныя людзі забяспечаць мір і бяспеку, былі выкананы. «Як я гаварыў, я паабяцаў людзям, што з сітуацыяй мы справімся», — рэзюмаваў беларускі лідар.

У час нарады ў штабе 56-га зенітнага ракетнага палка Аляксандр Лукашэнка даручыў адвесці войскі на паўднёвых рубяжах у месцы пастаяннай дыслакацыі. «Хачу, каб людзі ведалі (я абсалютна ўпэўнены і давяраю нашай разведцы): сітуацыя стабілізаваная на беларуска-ўкраінскай граніцы. Войскі іх адведзены. Таму, хлопцы, паглядзіце, і нашы войскі трэба адводзіць з граніцы. Каб яны разумелі (як мы дамаўляліся), што мы не збіраемся ваяваць і не збіраемся тут канцэнтраваць свае Узброеныя Сілы, акрамя сіл спецыяльных аперацый», — заявіў беларускі лідар.

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што трэба не прапусціць магчымыя пагрозы на заходнім напрамку. «І час, які прайшоў пасля таго, як я аб гэтым гаварыў, пацвярджае тое, што нам трэба не прапусціць з захаду. Вось там ідзе актывізацыя. Таму паўночна-заходні напрамак — там хлопцы павінны быць гатовы да ўсяго. Яны нас правакуюць, каб уцягнуць у гэтыя разборкі, у гэту вайну. Нельга гэтага дапусціць», — падкрэсліў беларускі лідар.

## Мы ніякія не ворагі для ўкраінцаў

У ходзе нарады кіраўнік дзяржавы заявіў аб планах абмеркаваць з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным далейшыя крокі па Украіне. «Як бы яны (ва Украіне. — **Заўвага**) на нас скоса ні глядзелі. Ну ледзь не ворагамі называюць. Мы ніякія не ворагі для ўкраінцаў. Я ўжо шмат разоў гаварыў. Гэта нашы людзі. Такія ж людзі, як мы, як рускія, расіяне. Нам трэба хутчэй дамаўляцца. Аказваецца, можна дамовіцца. Але галоўнае — трэба размаўляць. Калі няма дыялогу, размовы — гэта будзе эскалацыя і будуць гінуць людзі», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Ва Украіне нармальных людзей дастаткова. Асабліва сярод ваенных. Дамовіліся, — сказаў ён аб разрадцы сітуацыі на граніцы.— Думаю, добры прыклад для ўкраінцаў. Расіяне гатовы садзіцца за стол перагавораў і дамаўляцца. Абмяркоўваць і дамаўляцца».

### Меркаванне

## Усе хочуць міру

Вырашэнне праблемы, якая моцна непакоіла насельніцтва менавіта ў тыдзень, калі адзначаецца 30-годдзе інстытута прэзідэнцтва, яшчэ раз прадэманстравала, што Аляксандр Лукашэнка свае абяцанні перад народам выконвае. На гэта звярнуў увагу **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Алег ГАЙДУКЕВІЧ.** Але, па яго словах, важна звярнуць увагу і на іншы бок гэтай тэмы. «Захад вельмі хоча ўцягнуць Беларусь у зону баявых дзеянняў. Чаму? Украіна выдыхаецца, мабілізацыя не дапамагае, зброя пастаўляецца, а ваяваць няма каму. Цікавасць краін НАТА, якое фінансуе гэтую вайну, таксама губляецца. Таму ім вельмі важна ўцягнуць у канфлікт іншыя краіны. І Прэзідэнт разумее гэта. І ён прыняў самае правільнае рашэнне, — адзначыў ён. — Чаму ўдалося зняць напружанне? Першае — гэта моц ваенная, якую мы паказалі. Мы паставілі на граніцы «Паланэз», умацавалі граніцу і сцягнулі войскі. І далі зразумець: адна правакацыя — і мы адразу нанясём удары аж да цэнтра прыняцця рашэнняў. Яны ўбачылі, што мы можам гэта зрабіць. А другое — гэта дыпламатыя, мы не паддаліся на правакацыі. Прэзідэнт ніколі не дапускаў залішне ваяўнічых заяў, наша Міністэрства абароны таксама. То-бок, мы паказалі, што мы нікому не пагражаем, як заўжды гэта паказвалі. І спалучэнне гэтых фактараў адыграла сваю ролю — украінскія войскі адышлі ад граніцы, і мы свае прыбралі».

Алег Гайдукевіч падкрэсліў, што Прэзідэнт дзейнічае ў інтарэсах народа: «Любы беларус хоча міру, і ў Еўропе ўсе хочуць міру насамрэч, проста многія краіны несамастойныя. Калі б там былі ўлады, якія залежаць толькі ад народа, як Лукашэнка, яны б даўно дамовіліся аб міры і зрабілі б усё, каб Украіна не палала, таму што немагчыма ад гэтага адгарадзіцца».

# «ЧУВАШСКАЯ РЭСПУБЛІКА — ПАРТНЁР НОВЫ, АЛЕ ВЕЛЬМІ ПЕРСПЕКТЫЎНЫ»

## Па якіх кірунках можа развівацца супрацоўніцтва

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з кіраўніком Чувашскай Рэспублікі Алегам Нікалаевым, які ў гэтым статусе першы раз наведвае нашу краіну. Вітаючы гасцей, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што Чувашская Рэспубліка для Беларусі партнёр пакуль новы, але вельмі перспектыўны. У 2023 годзе тавараабарот склаў толькі 122 мільёны долараў, у 2022-м — прыкладна 120 мільёнаў. «Думаю, пасля гэтага візіту нам трэба падвойваць тавараабарот паміж рэспублікамі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён вылучыў кірункі, плённая праца па якіх можа дапамагчы ў названым павелічэнні.**

### Прамысловасць, транспарт, машынабудаванне

Вядучае пытанне для дэлегацыі Чувашскай Рэспублікі — супрацоўніцтва ў сферы прамысловасці. У планах гасцей — наведванне вядучых беларускіх прадпрыемстваў і перагаворы з намеснікам прэм'ер-міністра Пятром Пархомчыкам. «Што датычыцца прамысловасці. Ведаю, што ваш рэгіён стабільна ўваходзіць у дзясятку лепшых. А па тэмпах росту прамысловай і апрацоўчай вытворчасці ўвогуле ўваходзіце ў тройку найлепшых у Расіі, — адзначыў Прэзідэнт. — Беларусь гатова пашырыць ужо існуючую кааперацыю і гатова да рэалізацыі новых праектаў». Адпаведныя напрацоўкі ёсць.

Беларускія трактарабудаўнікі і вытворцы матораў пастаўляюць камплектуючыя і рухавікі на зборачныя канвееры Чабаксарскага трактарнага завода. Шасі МЗКЦ запатрабаваны на Шумерлінскім заводзе спецыялізаваных аўтамабіляў. МАЗ робіць для Чувашыі спецыяльна спраектаваную поўнапрывадную версію колавай базы. Шэраг нашых прадпрыемстваў пастаўляе кампаненты для электратэхнічнага кластара. «Значыць, ёсць даўняя і трывалая прамысловая інтэграцыя і кааперацыя», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Ён звярнуў увагу і на драйверы росту. Адзін з іх, па словах беларускага лідара, — у станкабудаванні: «Мы гатовыя распрацоўваць і выпрабляць для вас усю неабходную лінейку станкоў для металаапрацоўкі. Я думаю, калі вы прапануеце новы кірунак супрацоўніцтва з улікам нашых кампетэнцый, мы з задавальненнем пагодзімся».

«Вы ўжо прывыклі да таго, што па Чабаксарах ездзяць тралейбусы МАЗ, якія мы, дарэчы, збіраем на Уфімскім заводзе. Мы рады, што сёлета да кантракта на амаль сотню новых машын ёсць запыт яшчэ на 40 дадатковых адзінак. Ведаю, што рэгіён актыўна закупляе таксама беларускую грузавую, сельскагаспадарчую, камунальную, дарожную і спецыяльную тэхніку. У нас ёсць што прапанаваць вам, тым больш што мадэльны шэраг увесь час абнаўляецца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

### Аграпрамысловы комплекс

Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў Чувашыі, як і ў Беларусі, актыўна развіваецца сельская гаспадарка. Ён прапанаваў, калі будзе жаданне, пабудаваць у Чувашыі малочнатаварны комплекс, такі, як у Беларусі, «пад ключ». Яшчэ адна прапанова — прадукцыя Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыі — камбікармы і прэміксы для ўсіх кірункаў жывёлагадоўлі, уключаючы вырошчванне рыбы. Прэзідэнт адзначыў, што ў Беларусі выпрабляюць нядрэнныя ветэрынарныя прэпараты, якія, па яго словах, заўсёды будуць патрэбныя, як і лекі для людзей. «Ведаю, што беларускія навукоўцы дапамагаюць вашым селекцыянерам вырошчваць бульбу нашых сартоў. Вы правільна робіце, таму што мы пасля распаду Савецкага Саюза ўсе інстытуты ў Акадэміі навук захавалі, у тым ліку і інстытут бульбаводства. Гэта значыць, што мы кожны год ажыццяўляем сортаабмен нашай бульбы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён расказаў, што ўсе новыя сарты праходзяць апрабацыю, у тым ліку і на яго асабістым падвор'і, і пакуль нараканняў не было. «Таму вы правільна робіце, што досвед беларусаў і нашых вучоных выкарыстоўваеце. Будзе такая неабходнасць надалей — можаце на нас разлічваць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама падкрэсліў, што беларускаму боку быў бы цікавы досвед Чувашскай Рэспублікі ў вырошчванні хмелю.

***

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што, акрамя эканомікі, вельмі важна супрацоўнічаць і па гуманітарным кірунку — адукацыя, навука, культура, спорт.

«Я хачу, Алег Аляксеевіч, каб вы разумелі, усё, аб чым мы тут дамовімся, свята будзе выконвацца. Таму, калі нейкія пытанні ёсць, па якіх вы там прама зараз прынялі рашэнне, я з вялікім задавальненнем. Пабудзеце ў нас, паглядзіце прадпрыемствы, вытворчасці, пагаварыце ва ўрадзе і прыміце для сябе адпаведнае рашэнне. Калі трэба мне падключыцца — я абавязкова падключуся да вырашэння тых ці іншых пытанняў», — падсумаваў беларускі лідар.

### Кірункі ўзаемадзеяння напаўняюцца новым зместам

У сваю чаргу Алег Нікалаеў падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за пільную ўвагу ў рамках інтэграцыйнага працэсу да ўзаемадзеяння з рэгіёнамі, у прыватнасці з Чувашскай Рэспублікай, і расказаў, што ў гэтыя дні ў Беларусі працуе вялікая дэлегацыя Чувашскай Рэспублікі — каля 70 чалавек, прадстаўнікі самых розных сфер. «Акрамя тых кірункаў, якія вы агучылі, мы вельмі сур'ёзна папрацавалі і па лініі будаўніцтва, аховы здароўя. І бачым тут вялікія перспектывы для таго, каб узаемна адзін аднаго ўзбагаціць і падтрымаць», — падкрэсліў кіраўнік Чувашскай Рэспублікі. Ён падкрэсліў, што ўжо ёсць пэўныя дамоўленасці ў будаўнічай сферы.

Кіраўнік Чувашскай Рэспублікі расказаў, што ў рэгіёне па даручэнні Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі зараз будуецца шмат аб'ектаў. У найбліжэйшы час пачнецца будаўніцтва рэспубліканскай клінічнай бальніцы. «І тут могуць быць запатрабаваныя не толькі кампетэнцыі будаўнічай галіны Беларусі, але і будаўнічыя матэрыялы. У тым ліку па асобных кірунках будаўнічыя матэрыялы дазволяць і імпарт замясціць, і грошы сэканоміць. Мы аб усім гэтым папярэдне дамовіліся», — расказаў Алег Нікалаеў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**